# БАР'ЕР ДАСТУПНАСЦІ ІНФАРМАЦЫІ: СТАРАЯ ПРАБЛЕМА Ў НОВЫХ УМОВАХ

**Дзямешка Л. А.,**
**кандыдат педагагічных навук, прафесар кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў**

Паспяховае развіццё інфармацыйнага грамадства, да якога крочыць чалавецтва, залежыць ад свабоднага і раўнапраўнага доступу да інфармацыі. Асабліва гэта датычыць інфармацыі, якая знаходзіцца ў дзяржаўных публічных установах — бібліятэках, музеях, архівах.

Доступ да інфармацыі — не толькі каштоўнасць інфармацыйнай дзейнасці гэтых устаноў, яна прызнана адной з важнейшых каштоўнасцей сучаснай цывілізацыі. Гэта адлюстравана ў шэрагу дакументаў міжнароднага значэння. Можна нагадаць «Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека», прынятую Генеральнай асамблеяй ААН (арт.19), «Пастанову аб свабодзе чытання» (ЮНЕСКА, 1953 г.), «Маніфест аб публічных бібліятэках» (ІФЛА — ЮНЕСКА, 1994 г.), «Рэзалюцыю аб ролі бібліятэк у сучасным грамадстве» (Еўрапарламент, 1998 г.), «Заяву аб бібліятэках і інтэлектуальнай свабодзе» (ІФЛА, Камітэт па свабоднаму доступу да інфармацыі, 1999 г.), «Прынцыпы для еўрапейскай культурнай палітыкі: публічны доступ і свабода выказвання ў арганізацыях і ўстановах культуры» (Савет Еўропы, 2000 г.).

Права на свабоду інфармацыі адлюстравана і ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь. У Канстытуцыі адзначаецца, што кожнаму грамадзяніну гарантуецца свабода поглядаў, перакананняў і іх вольнае выказванне: права на атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі (арт. 34). У законе «Аб інфарматызацыі» (1995 г.) адзначаецца, што юрыдычныя і фізічныя асобы маюць права на атрыманне дакументаванай інфармацыі (арт. 9.); у законе «Аб электронным дакуменце» (2000 г.) устаноўлены прававыя асновы прымянення электронных дакументаў (арт. 5). Артыкулы аб свабодным доступе да інфармацыі ўтрымліваюць заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь: «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі» (1995 г.), «Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» (1996 г.). Важнейшым палажэннем закона «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь» (2002 г.) з'яўляецца гарантаваны доступ да бібліятэчных фондаў як забеспячэнне аднаго з істотных канстытуцыйных правоў грамадзян — свабоды доступу да інфармацыі, якая ва ўсім свеце прызнаецца адкрытай і якая не ўяўляе дзяржаўнай ці камерцыйнай тайны.

Такім чынам, грамадства рэгулюе інфармацыйную дзейнасць асобы, выпрацоўвае адпаведныя маральныя нормы, стварае заканадаўчыя акты, якія тычацца захавання, прадстаўлення і спажывання інфармацыі. Даючы права на свабоду доступу да інфармацыі, заканадаўства вызначае і нормы абароны інфармацыі. У 1950 г. прынята Еўрапейская канвенцыя аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод, дзе ўдакладняецца пералік абмежаванняў правоў у межах прадухілення злачынстваў, абароны здароўя і агульнапрынятай маралі (арт. 10). У «Міжнародным пакце аб грамадзянскіх і палітычных правах», прынятым у 1996 г., даецца больш падрабязны пералік абмежаванняў, неабходных для аховы дзяржаўнай бяспекі, грамадскага ладу, фізічнага і духоўнага здароўя насельніцтва, у прыватнасці, прапаганда вайны, выступленні на карысць нацыянальнай, расавай ці рэлігійнай нянавісці, дыскрамінацыі асобы, варожасці (арт. 20). Закон «Аб дзяржаўных сакрэтах», прыняты ў Рэспубліцы Беларусь у 1995 г., вызначае звесткі, якія могуць быць аднесеныя да дзяржаўных сакрэтаў. Яны датычаць знешніх зносін, абароназдольнасці краіны, эканомікі, абаронна-вышуковай дзейнасці (арт. 21).

Увогуле, абарона інфармацыі забяспечваецца патрабаваннем рэгістрацыі інфармацыйных рэсурсаў і сістэм, упарадкаваннем дзейнасці службаў сертыфікацыі і ліцэнзіравання, устанаўленнем парадку аднясення інфармацыі да розных катэгорый доступу: адкрытая інфармацыя; інфармацыя, што ўтрымлівае дзяржаўную тайну, канфідэнцыянальная інфармацыя аб прыватным жыцці грамадзян, выкарыстанне якой не дазваляецца.

Уласна, у заканадаўстве адлюстравана рэальна існуючая супярэчнасць паміж неабходнасцю свабоды доступу да інфармацыі і яе абаронай, абмежаваннем выкарыстання ў пэўных выпадках. Гэтая антынымія ўзнаўляецца на працягу ўсёй гісторыі чалавецтва. Высвятляецца праблема, якая дзейнічае на працягу шэрага стагоддзяў і звязаная з інфармацыяй, — праблема яе каштоўнаснай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ідэнтыфікацыі. Зыходзячы з каштоўнасных установак асобы, сацыяльнага інстытута, дзяржавы, адны кнігі, дакументы прызнаюцца карыснымі, другія — шкоднымі для чытання. На гэтай падставе адны прапагандуюцца, рэкламуюцца, другія — забараняюцца, знішчаюцца ці проста не дапускаюцца да карыстальнікаў.

Гісторыя ведае шмат прыкладаў абмежавання доступу да інфармацыі.

Яшчэ да нашай эры кітайскі імператар Цынь Шыхуандзі распарадзіўся спаліць усе кнігі, акрамя літаратуры па гісторыі сваёй дынастыі і даведнікаў па медыцыне, гаданні і сельскай гаспадарцы. У старажытным Рыме былі спалены па распараджэнню Сената кнігі гісторыка Крэмуцыя Корда [1, с. 31].

На Русі XIV–XVII стст. склад кніг у манастырскіх бібліятэках кантралюецца духавенствам. Забараняецца чытанне кніг, супрацьлеглых догмам царквы. Творы «ерэтыкоў», «чарнакніжнікаў», «вольнадумцаў» выключаюцца з манастырскіх бібліятэк і знішчаюцца. Паяўляецца практыка складання спісаў твораў, якія дазвалялася або забаранялася чытаць. У XVII ст. асаблівую цікавасць выклікаюць рукапісныя забароненыя кнігі, а таксама «прелестные» і «подмётные» пісьмы. За чытанне і распаўсюджанне антыпрыгонніцкай літаратуры вінаватыя неслі кару, а кнігі знішчаліся. У XVIII ст. у сувязі са стварэннем універсітэцкіх бібліятэк арганізацыя чытання студэнтаў асабліва турбуе ўрад. Па яго ўказу для студэнтаў ствараюцца асобныя фонды, якія ўключалі падручнікі, слоўнікі, даведачныя выданні. «Пастаронні» кнігі, прагрэсіўная руская і замежная літаратура забараняюцца. Такім чынам, урад хацеў, каб бібліятэкі фарміравалі студэнцкую думку ў адпаведнасці з «пользой и благом отечества». У публічных бібліятэках існавала практыка ачысткі бібліятэк ад «зламысных і шкодных» кніг [2, с. 42].

У 40 — 50 гг. XIX ст. у бібліятэкі засылаліся тайныя агенты, якія сачылі за чытаннем, рабілі вобыскі, знойдзеныя забароненыя кнігі знішчаліся, вінаватыя ішлі пад суд, ссылаліся ў Сібір.

У XIX ст. пры буйных бібліятэках у Расіі ствараліся сакрэтныя аддзелы для захавання забароненых кніг і рукапісаў. У XX ст. іх замянілі спецсховішчамі. У другой палове XIX ст. ганенню належалі кнігі «шкоднага сацыялістычнага вучэння», асабліва распаўсюджаныя ў нядзельных школах і народных чытальнях. У выніку сакрэтным цыркулярам царскага ўрада ўсе нядзельныя школы і народныя чытальні былі зачынены. Цэнзура сачыла і за мараллю. Цікавы такі прыклад. У 1876 г. нехта А. Уладзіміраў звярнуўся да ўрада з прапановай аб выключэнні з хрэстаматыі для дзяцей верша А. Пушкіна «Няне» («Выпьем, добрая подружка бедной юности моей»), як непрыгоднага для юнацтва. На яго зварот была накладзена рэзалюцыя Аляксандра II: «Сообщить гр. Толстому. Весьма справедливо» [4, с. 48].

Канец XIX — пачатак XX стст. характарызуецца барацьбой за масавага чытача паміж царскім урадам і прадстаўнікамі марксісцкай ідэалогіі. Паміж імі стаялі прадстаўнікі буржуазна-дэмакратычнага накірунку. Галоўным у іх дзейнасці была культурная адукацыя народа, распаўсюджванне і папулярызацыя ведаў па-за ідэалагічным зместам. Яны змагаліся за свабоду выбару кніг для чытання, за апалітычнасць бібліятэк. Дыскусія, якая адбылася на I Усерасійскім з'ездзе па бібліятэчнай справе (1911 г.) — пацвярджэнне гэтаму. Свабодай выбару кніг для чытання кіраваліся і створаныя на Беларусі культурна-асветніцкія грамадскія ўстановы: Гродзенскае педагагічнае Таварыства (1907 г.), Слуцкае Таварыства адукацыі (1909 г.), Таварыства Полацкай бібліятэкі (1912 г.), Віцебскае Таварыства адукацыі (1913 г.). Пры таварыствах дзейнічалі цэнтральныя бібліятэкі і бібліятэкі-чытальні ў «народных дамах», пабудаваных у вёсках на грамадскія грошы. Кнігі беларускіх, польскіх, расійскіх, украінскіх аўтараў набываліся ў Вільні, Гродне, Навагрудку, Слоніме; сярод іх была «вольналюбівая» літаратура, накіраваная супраць царскага ўрада, кнігі аб неабходнасці распаўсюджвання асветы сярод беларускага народа [6].

Быў нейкі невялікі прамежак часу ў пачатку XX ст., калі ўраду было не да кантролю за свабодай чытання: змена ўлады, грамадзянская вайна, голад, разбурэнні ў краіне. А ўжо з 20-х гадоў пачынаецца злосная культурная інквізіцыя. У бібліятэках пад забаронай аказалася лепшая літаратура стагоддзя. У трох цыркулярах за подпісам Н. К. Крупскай [5] пад забаронай стала творчасць Булгакава, Платонава, Ахматавай, Гумілёва, Цвятаевай, Валошына. Забаронена для чытання адна з самых светлых і рамантычных паэм А. Грына «Бегущая по волнам», кнігу выключылі з фондаў бібліятэк як містычны твор. Не выдавалі С. Ясеніна («носьбіт рэлігійна-патрыярхальнай у спалучэнні



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з вулічнай псіхалогіі»); забаранілі Ф. Дастаеўскага («носьбіт шкодных махрова — кансерватыўных поглядаў, схільнасць да стварэння паталагічных вобразаў»); перакрэслілі А. Фета («махровы прыгоннік, якога не любіў Ленін»). Кнігі гэтых аўтараў былі выкрэслены з фондаў бібліятэк і выведзены з чытацкага ўжытку.

На Беларусі палітыка забароны і знішчэння «непатрэбных» кніжак здзяйснялася сістэматычна і паслядоўна. У 1926 г. прайшоў Усебеларускі сход загадчыкаў акружнымі палітасветамі. У рэзалюцыі сходу адзначалася: «Ідэалагічны змест кніжнага складу бібліятэк былых павятовых гарадоў не адпавядае моманту, а пагэтаму неабходна ўзяць рашучы напрамак на скончэнне працы па із'яццю ўстарэлых і непадыходзячых кніжак» [7, с.91].

У рэзалюцыі I Усебеларускай клубнай нарады па пытаннях бібліятэчнай работы (1930 г.) гэтая пазіцыя адзначана больш рэзка: «Нарада катэгарычна патрабуе пад адказнасць бібліятэчных работнікаў і загадчыкаў клубаў рашучай ачысткі бібліятэк ад непатрыятычнай і варожай літаратуры» [7, с.145]. Прэзідыум Белсаўпрафа 11 снежня 1957 г. прыняў пастанову «Аб стане і мерах паляпшэння работы прафсаюзных бібліятэк», у якой дэкларааўся найстражэйшы кантроль за своечасовым і поўным выключэннем з фондаў бібліятэк «устаревших» кніг па спісах, што выдаваліся Усесаюзнай Кніжнай палатай [7, с.250].

Камплектаванне бібліятэк здзяйснялася ў адпаведнасці з дзяржаўнай ідэалогіяй, прынцыпам партыйнасці: бібліятэкі атрымлівалі з Галоўліта СССР і Галоўліта БССР спісы забароненых ці дазволеных твораў. (У 1991 г. гэтыя фонды былі рассакрэчаны і аб'яўлены агульнадаступнымі). Для фондаў бібліятэк Беларусі пагібельным стаў загад Галоўліта БССР пад № 33 ад 3 чэрвеня 1937 г. пад назвай «Спіс літаратуры, якая падлягае канфіскацыі з бібліятэк, грамадскага карыстання, навучальных устаноў і кнігагандлю». Спіс «шкодных кніжак» заняў 111 старонак і налічваў 421 пазіцыю. У яго ўвайшлі кнігі Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, паэма «Тарас на Парнасе», тэрміналагічныя слоўнікі, даведнікі, граматыкі, чытанкі, падручнікі, навучальныя дапаможнікі, мовазнаўчыя працы. «Шкодныя кнігі» гэтым загадам былі знішчаны, скасаваны ў каталогах і картатэках бібліятэк, а разам з імі загінуў і цэлы пласт нацыянальнай культуры Беларусі. Пасля сталінскіх рэпрэсій з фондаў бібліятэк зніклі і кнігі ўсіх рэпрэсіраваных аўтараў, а іх было 200 чалавек.

Загаду № 33 было наканавана доўгае жыццё. Ён захоўваў сілу дзесяцігоддзямі, толькі змяняючы і ўдакладняючы лексіку. (Замест слова «канфіскацыя» сталі ўжываць «ачыстка»). У 1954 г. «ачышчалі» бібліятэкі ад палітычна шкоднай літаратуры, у 1961 — ад твораў «з'ехаўшых за мяжу здраднікаў» і «дэкадэнтаў».

Такім чынам, ідэалагічны ці выхаваўчы бар'ер даступнасці інфармацыі на працягу ўсёй гісторыі з'яўляўся адной з перашкод на шляху кнігі да чытача. Метады розныя — ад варварскага знішчэння кніг нацыстамі да «цывілізаванага» пераводу іх у спецсховішчы ці «нерэкамендацыі» для чытання ў бібліятэках. Праблема каштоўнаснай ідэнтыфікацыі інфармацыі, якую мы зрабілі спробу прасачыць, мае яшчэ і іншы аспект, асабліва актуальны для любога інфармацыйнага органа: сучасны аб'ём інфармацыі не дазваляе ў поўным аб'ёме мець яе. Таму ўзнікла праблема адбору інфармацыі, якую прызвана вырашаць экспертыза каштоўнасці дакумента.

Тут шмат супярэчнасцей. Якім чынам бібліятэка зможа выконваць сваю функцыю сацыяльнай памяці? Як устанавіць аб'ектыўныя прынцыпы адбору інфармацыі? Як дабіцца аб'ектыўнасці экспертаў, якія ў межах сваіх амбіцый па палітычных ці іншых матывах могуць выключаць інфармацыю, што не адпавядае іх інтарэсам?

Вядома, што самы верагодны шлях — гэта мініяцюрызацыя носьбітаў інфармацыі, сістэматычнае тэхніка-тэхналагічнае абнаўленне, размежаванне сферы дзеяння бібліятэк, архіваў, музеяў, іншых устаноў індустрыі інфармацыі; стварэнне адзінага размеркавальнага фонду з тым, каб сукупная памяць чалавецтва ўключала ўсю інфармацыю (і тую, што сёння ўяўляецца значнай і нязначнай). Бо сёння інфармацыйныя цэнтры нясуць адказнасць за інфармацыйнае забеспячэнне будучых пакаленняў.

Акрамя ідэалагічнага і выхаваўчага бар'ераў доступу да інфармацыі існуе і шмат іншых — сацыяльны (Інтэрнет, тэхналагічна складаныя паслугі патрабуюць пэўных матэрыяльных затрат); фізічны (недаступнае для карыстальнікаў размяшчэнне інфармацыйных рэсурсаў, недастатковая арыента-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыя ў іх месцазнаходжанні); арганізацыйна-тэхналагічны, тэхніка-эканамічны, прававы (звязаны з нявырашанымі юрыдычнымі праблемамі інфармацыйнай дзейнасці); маральны, экалагічны і інш.

З развіццём Інтэрнета праблема абмежавання свабоды інфармацыі не знікла. З'явілася цэнзура ў сетцы Інтэрнет, сістэмы фільтрацыі і блакіравання інфармацыі. Праблема доступу да інфармацыі існуе. Яна становіцца не менш актуальнай па меры развіцця інфармацыйнага грамадства.

ЛІТАРАТУРА


1. Баренбаум И. Е. Всеобщая история книги // Современное библиотечно — информационное образование: Учеб. тетради. Вып. 1. СПб. 1996.
2. Бородина В. А. Библиотечное обслуживание: Учебно-метод. пособие. М., 2004.
3. Библиотечное дело в БССР: Документы и материалы: 1941–1958. Мн., 1984.
4. Дворкина М. Я. Информационное обслуживание. Социокультурный подход. М., 2001.
5. Крупская Н. К. Укрепим библиотечное дело. М., 1929.
6. Пазашкольная асвета. Культурна — асветніцкая праца ў гуртках Таварыства беларускай школы. Вільня, 1928.
7. Библиотечное дело в БССР: Документы и материалы: 1918–1941. Мн., 1978.



***Dziameshka L. A.***

*THE BARRIER OF ACCESS TO INFORMATION: THE OLD PROBLEM UNDER NEW CONDITIONS*

*The article raises the problem of free and equal access to information in the era of the information society. The author describes the recent documents accepted at the IFLA committee on free access to information and by the Council of Europe. She also provides the historical perspective on free access to information from ancient times in Russia and some other countries till nowadays.*


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## НЕОАКСИОЛОГИЯ И СТРУКТУРАЛЬНЫЕ ПОЛЯ КУЛЬТУРЫ


**Салеев В. А.,**
**доктор философских наук**


Философские учения, подобно людям и книгам, имеют свою судьбу.

Аксиология, понимаемая как философское учение о ценностях, появляется лишь в конце XIX в. Разумеется, аксиологическая проблематика нашла достаточно явное отражение в античной философии и была в той или иной мере представлена и в доктринах средневековых теологов, и в учениях философов Возрождения и Просвещения, но обобщённого взгляда на ценностный мир (тем более — на ценностно-оценочное отношение) до XIX в. не существовало. Другие отрасли философии — онтология и гносеология — к этому времени ушли далеко вперед, что связано с интенциями развития человеческого общества. Так, ведущим философским учением в течение XVII—XX вв. становится гносеология — учение о познании (в некоторых философских школах более употребим термин для теории познания — эпистемология, с акцентом на теоретико-познавательный субстрат). Вероятно, это связано с парадигмой Просвещения, с самим фактом вхождения науки в ареал культуры, всё более утверждающимся приоритетом Разума в общественной жизни в новое время (в отличие от приоритета Веры, определявшего средневековую ментальность). Во всяком случае, гносеологическая проблематика уже в XVII в. «находилась в центре философских дискуссий, а в учении Г. Гегеля само развитие человечества было определено как познавательный процесс — процесс «самопознания Абсолютного Духа» [1, с. 9].

И только в 60-70 гг. XIX в. аксиологическая проблематика выделяется в специальную область философии. В недавней работе [2] нам удалось показать, как «крёстный отец» аксиологии Рудольф Г. Лотце осуществил дифференциацию между познанием, основанным на объективном мышлении, дающим реальную картину бытия вещей и явлений и их значимостью. Р. Г. Лотце определяет три основные рядоположные сферы, которые основополагающим образом влияют на характер человеческой жизнедеятельности: действительность, истинность и ценность. Важно и то, что ценностный мир он связывает с высшими (духовными) идеалами человеческого бытия.